Белорусского научно-исследовательского центра электронной документации от 14 декабря 2004.
9. Закон Республики Беларусь «Об электронном документе» от 10 января 2000г. № 357-З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2002. – №2/132.
10. СТБ 1221-2000 «Документы электронные. Правила выполнения, обращения и хранения».- Мн.: Госстандарт, 2000.
11. СТБ 1176.2-99 «Информационная технология. Защита информации. Процедуры выработки и проверки электронной цифровой подписи». – Мн.: Госстандарт, 2000; СТБ 1176.1-99 «Информационная технология. Защита информации. Функция хэширования». – Мн.: Госстандарт, 2000.
12. Указ Президента Республики Беларусь от 24 сентября 2001 года № 516 «О совершенствовании системы республиканских органов государственного управления и иных государственных организаций, подчиненных Правительству Республики Беларусь» // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2001. – №92, 1/3078.

# МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ДАСЛЕДВАННЯ ПЫТАННЯ ПАДАРОЖЖАЎ ЖЫХАРОЎ ВКЛ І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У XVI-XVIII стст

**І. В. Чыжык**

Даследванні ў галіне мемуарыстыкі з кожным годам адкрываюць чытачам ўсе новыя і новыя імены айчынных падарожнікаў.Пры гэтым вывучэнне саміх падарожжаў праходзіць па розных накірунках. З аднаго боку, ствараюцца працы агульнатэарытычнага характару, у якіх разглядаецца цэлы комплекс дыярушаў і праводзіцца іх параўнальны аналіз. З другога боку – канкрэтызуецца праблематыка і даследчыкі дэталева асэнсоўваюць канкрэтнае падарожжа.

Вельмі актыўна распрацоўваецца дадзеная тэматыка польскімі навукоўцамі. Прычым закранаюцца не толькі ўласна польскія дыярушы, але і творы іншаземцаў, што дазваляе праводзіць аналогіі, рабіць высновы наконт узроўня развіцця грамадскай думкі, кругагляду жыхароў Рэчы Паспалітай.

Значная колькасць публікацый на польскай мове маюць агульную накіраванасць, у іх абмяркоўваецца шырокае кола пытанняў паўсядзеннага жыцця падарожнікаў, значэнне перыгрынацый для развіцця культуры, ментальнасці і г.д. Адной з найбольш грунтоўных публікацый на тэму дыярушаў XVI–XVII ст. з’яўляецца праца Ганны Дзехцінскай [8]. Дзеннікі цікавяць аўтара як своеасаблівыя крыніцы, якія адлюстроўваюць агульныя культурна-гістарычныя працэсы, і пры гэтым прадстаўляюць агульнаеўрапейскую каштоўнасць. Зразумець сам феномен падарожніцтва, «ахарактарызаваць тую неадназначную і складаную

сукупнасць фактараў, якія паўплывалі на творчасць падарожнікаў падчас апісання краін і людзей»– асноўная мэта даследвання [8,с.6].

Да агульнатэарытычных адносіцца і праца А. Мачака[9]. У ей разглядаюцца пытанні шляхоў зносін і маршрутаў вандровак, месцы наведвання і кошты падарожжаў, мытныя асаблівасці, гігіена, небяспечнасці ў дарозе і бацькоўскія «інструкцыі», навукі «ва універсітэтах», цуды, выноскі з падарожжаў і г.д.

Некаторыя манаграфіі польскіх аўтараў умяшчаюць у адной кнізе і першакрыніцы, дыярушы, і каментарыі да іх з аналізам [7]. З часоў Рэнесансу сталі распаўсюджвацца навуковыя падарожжы ва універсітэты Германіі, Італіі, інш. Папулярнейшым тэрыторыям у гэтым ракурсе прысвечана даследванне Д. Золадж-Стрэльчык [11], якое падае сведчанні аб стасунках Рэчы Паспалітай з еўрапейскімі краінамі ў галіне навуковай.

Вобраз Гданьска ў літаратуры падарожніцкага характару разглядаецца ў публікацыі Я. Сампа [10]. Увогуле, апошнія працы адносяцца да накірунку асобнага крыніцадаследчага характару.

Што датычыцца якасці і вартасці айчынных і расійскіх даследванняў, то неабходна памятаць пра адносную «маладосць» тэматыкі падарожжаў. Цяжка пераацаніць, але і недаацэньваць мясцовыя дасдедванні нельга. Напэўна адным з першых аўтараў, які звярнуўся да тэматыкі падарожжаў нашых суайчыннікаў быў В. П. Грыцкевіч. Яго манаграфіям папярэднічаў шэраг артыкулаў у часопісах, якія надалей былі дапоўнены і перапрацаваны і ўвайшлі ў склад яго кніг. Ім быў ўзняты на паверхню і данесены да чытача вялізарны пласт інфармацыі, выкладзены ў захапляльнай манеры зразумелай мовай. Пры гэтым, працы В. П. Грыцкевіча маюць як агульнатэарытычны [1, 2], так і крыніцадаследчы характар [3]. Асноўная мэта аўтара кніг – пашырэнне ведаў суайчыннікаў аб невядомай гістарычнай спадчыне: «выходцы из Белоруссии совершили немало увлекательных путешествий <…> и исследование их прогрессивного наследия позволяет значительно пополнить наши знания о развитии научной мысли в Белоруссии» [1,с.3].

Разглядаючы пытанне вандровак нашых землякоў у Сібір нельга абмінуць прысвечаныя гэтай тэме працы Б.П.Палявога [4]. Артыкулы распавядаюць аб «Дыярушы» А. Каменскага-Длужыка і даецца яго характарыстыка. Робяцца і спасылкі на даследванні іншых навукоўцаў па дадзенаму нататку.

Сярод беларускіх даследчыкаў трэба таксама вылучыць Казакова Ю. Л., які сумесна з польскім гісторыкам Богданам Рокам распрацоўваюць падарожніцкую праблематыку ў кантэксце агульнагістарычным.

Дарэчы вынікам іх сумесных даследванняў сталі два артыкулы (у беларускім друку) [5, 6], прысвечаныя розным па характару вандроўкам з XVIII стагоддзя.

Такім чынам, пералічаныя даследванні дазваляюць скласці ўяўленні аб падарожжах, асобах падарожнічаючых, прычынах адпраўлення за мяжу і іх наступствах. Тэматыка папаўняецца з кожным годам усе новымі і новымі даследваннямі і есць падстава лічыць яе адной з цікавейшых галінаў гістарычнай навукі.

**Літаратура**


1. *Грицкевич В. П.* Путешествия наших земляков. Мн., 1968.
2. *Грицкевич В. П.* От Немана к берегам Тихого океана. Мн., 1986.
3. *Грыцкевіч В. П.* Адысея наваградскай лекаркі. Мн., 1989.
4. *Полевой Б. П.* Еще раз о Каменском-Длужике // Советская этнография. 1974 № 4.
5. *Рок Б., Казаков Ю.* Апісанне падарожжа з Мінска ў Пецярбург ананімнага беларускага шляхціца // БГЧ. 1998, №1.
6. *Рок Б., Казаков Ю.* Тэафіла Канстанцыя Мараўская з роду Радзівілаў і яе падарожжа па Еўропе // БГЧ. 2006 №2.
7. Dwa polskie pamietniki z Syberii (red. *A Kuczinskiego)*. W-Wr., 1996.
8. *Dziechcinska H.* O staropolskich dziennikach podrozy. W., 1991.
9. *Maczak A.* Zycie codzienne w podrozach po Europie XVI–XVIII w. W., 1980.
10. *Samp J.* Gdansk w relacjach z podrozy: 1772–1918. Gd., 1991.
11. *Zoladz-Strzelczyk D.* Peregrinatio academica. P., 1996